11. НГАБ. Ф 1430. Воп. 1. Спр. 29891.
12. Полное собрание законов Российской империи: собрание 2-е с 1825 по 1881 г.: в 55 т. СПб.: Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830–1884.
13. Сборник материалов, относящихся до архивной части в России. Пг: Тип. Министерства земледелия, 1917. Т. 2.
14. Шумейко М. Ф. Витебский центральный архив древних актовых книг в XIX – начале XX вв. и последующая судьба его документальных собраний // Витебщина архивная: история, фонды, персоналии (середина XIX–XX вв.) / сост. М. В. Пищуленок и др. ; науч. ред. М. Ф. Шумейко. Минск: БЕЛНИИДАД, 2002. С. 4–13.
15. Шумейко М. Витебский центральный архив древних актовых книг – первый исторический архив Беларуси (к 145-летию создания) // Архивы и делопроизводство. 2007. № 4. С. 94–98, № 5. С. 84–87.
16. Lietuvos valstybės istorios archyvas (LVIA). F. 378. 1843. Bib. 1975.

# АРХІВЫ БЕЛАРУСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У СКЛАДЗЕ БЕЛАРУСКАГА МУЗЕЯ ІМЯ І. ЛУЦКЕВІЧА Ў ВІЛЬНА

***В. С. Іванова***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт,*
*вул. Мендзялеева, 36, 220037, г. Мінск, Беларусь, ivanovavs@bsu.by*

Беларускі музей імя І. Луцкевіча ў Вільна (1921–1945) з'яўляўся не толькі цэнтрам збірання прадметаў гісторыі і культуры Беларусі, але кніг, рукапісаў, асабістых архіваў і архіваў арганізацый. Па захаваных каталогах і вопісах ў артыкуле прасочваецца траекторыя іх збірання, а пасля ліквідацыі музея – іх перамяшчэнне ў складзе дзяржаўных сховішчаў Літвы і Беларусі. Праведзена навуковая рэканструкцыя больш дзесятка архіваў беларускіх арганізацый, што захоўваліся ў Беларускім музеі імя І. Луцкевіча ў Вільна.

***Ключавыя словы:*** архіўная рэканструкцыя; музей; архівы беларускіх арганізацый; каталогі; вопісы.

# АРХИВЫ БЕЛАРУСКИХ ОРГАНИЗАЦИЙ В СОСТАВЕ БЕЛАРУСКОГО МУЗЕЯ ИМЕНИ И. ЛУЦКЕВИЧА В ВИЛЬНО

***О. С. Иванова***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Менделеева, 36, 220037, Минск, Беларусь, ivanovavs@bsu.by*

Беларуский музей имени И. Луцкевича в Вильно (1921–1945) был не только центром сбора предметов истории и культуры Беларуси, но и книг, рукописей, личных архивов и архивов организаций. На основе сохранившихся каталогов и описей в статье прослеживается путь их собирания, а после ликвидации музея – и их движение в рамках государственных хранилищ Литвы и Беларуси. Проведена научная реконструкция более десятка архивов беларуских организаций, хранившихся в Беларуском музее имени И. Луцкевича в Вильно.

***Ключевые слова:*** архивная реконструкция; музей; архивы беларуских организаций; каталоги; описи.

# ARCHIVES OF THE BELARUSIAN ORGANIZATIONS IN THE BELARUSIAN MUSEUM OF I. LUTSKEVICH IN VILNA

***V. S. Ivanova***

*Belarusian State University,*
*st. Mendzialeeva, 36, 220037, Minsk, Belarus, ivanovavs@bsu.by*

The Belarusian Museum of I. Lutskevich in Vilnia (1921–1945) was not only a center for collecting objects of the history and culture of Belarus, but also books, manuscripts, personal archives and archives of organizations. Based on the preserved catalogs and inventories, the article traces the trajectory of their collection, and after the liquidation of the museum, their movement in the state repositories of Lithuania and Belarus. Scientific reconstruction of more than a dozen archives of Belarusian organizations, which were stored in the Belarusian Museum of I. Lutskevich in Vilnius, was carried out.

***Key words:*** archival reconstruction; museum; archives of Belarusian organizations; catalogs; inventories.

Беларускі музей імя І. Луцкевіча ў Вільна (1921–1945) з'яўляўся не толькі цэнтрам збірання прадметаў гісторыі і культуры Беларусі, але кніг, рукапісаў, асабістых архіваў і архіваў арганізацый. Архіў Музея арганічна фарміраваўся з бягучых дакументаў рэдакцыі газеты «Наша Ніва», Беларускага навуковага таварыства (БНТ) ды іншых беларускіх арганізацый, якія дзейнічалі ў Вільні ў міжваенны перыяд. Дакументы выкарыстоўваліся пераважна супрацоўнікамі Музея [1, с. 162–169]. Калі віленскія беларускія арганізацыі спынялі працу, што стала асабліва актуальна з сярэдзіны 1930-х гг., то адзіным сховішчам, якое магло прыняць гэтыя дакументы, заставаўся Музей. Па праведзеных падліках тут захоўвалася каля 9 тыс. спраў і значна большая колькасць дакументаў [2, с. 132]. Музей меў даволі значнае бягучае справаводства і пэўны комплекс уліковых дакументаў, у якіх асобна фіксаваўся склад і колькасць прадметаў, кніг, рукапісаў і архіваў. Магчыма, як і калекцыянаванне рукапісаў і музейных прадметаў, так і іх каталагізаванне было запачаткавана яшчэ І. Луцкевічам да стварэння Музея.

Першае вядомае апісанне рукапісаў і архіваў захоўваецца ў складзе калекцыі 23 Аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (АРКР ЦНБ НАН). Гэта каталог рукапісаў (РК), які складаецца з 203 запісаў (з № 2 па № 209. Некаторыя запісы адсутнічаюць) [3]. Ён паступова вёўся і папаўняўся інфармацыяй аб набытках, найбольш верагодна, з 1921–1922 гг., пачатку вядзення інвентарнай кнігі музейных прадметаў. Пераважная большасць праанатаваных ў каталозе дакументаў адносіцца да 1928 г. Адзіны дакумент РК–54 аб грамадскім судзе над А. Луцкевічам і Р. Астроўскім адносіцца да

1934–1935 гг. А апошні запіс, аб перадачы рукапісаў Я. Купалы ў мемарыяльны музей у Мінску, – аж да пачатку 1945 г. Дакументы, што паступілі ў музей ў другой палове 1930-х гг., а магчыма, і значная частка ранейшых рукапісаў, у каталог унесены не былі, бо, па некаторых сведчаннях, – магчымасцяў на правядзенне каталагізацыі ў гэты час не было.

Да першай тэматычнай катэгорыі дакументаў, праанатаваных у азначаным каталозе, можна аднесці апісанні царкоўных рукапісных кніг (трэбнікаў, эвангелляў, акафістаў, апосталаў і інш.) за XVI–XIX стст. Тут можна згадаць вядомы «Аль-кітаб XVI ст. на беларускай мове арабскім пісьмом, які быў атрыманы І. Луцкевічам ад мулы Петракевіча з в. Сорак Татараў каля Трок». Гэта рукапіс у скураной вокладцы на 138 лістах in folio. Ён значыцца ў каталозе пад нумарам РК-7. Другая частка каталогу пад №№ 17–52 і 84–98 – гэта інвентары, апісанні, прывілеі, метрычныя запісы з розных цэркваў і касцёлаў Віленшчыны, Ашмянскага павета, Кейданаў, якія адносяцца пераважна да XVIII–XIX стст. Наступныя часткі пад №№ 57–72 – карэспандэнцыя Канстанціна Тышкевіча (другая палова XIX ст.), 73–83 – літэрарыя, рукапісы З. Бядулі, Я. Купалы, І. Легатовіча. І, нарэшце, самая вялікая частка – дакументы беларускіх арганізацый: Таварыства беларускай школы (ТБШ) (№№ 103–135, 141–152, 173–178), Беларускага нацыянальнага камітэту (БНК) у Вільна (202–207), Цэнтральнай беларускай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны (136–140, 204–205, 208), Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (157–172), Беларускага праваслаўнага таварыства (154–156, 180–181), Беларускай вайсковай рады (209). Тэматычная структура каталога рукапісаў захавалася і дапаўнялася найдалей, што бачна па структуры сучасных Віленскага беларускага фонда ў Бібліятэцы Урублеўскіх (MABL) [4] і калекцыі дакументаў музея імя І. Луцкевіча ў Вільна [5] у Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ) і іншых сумежных фондах.

2 снежня 1935 г. у музеі была распачата таксама «Інвентарная кніга Беларускага музею імя І. Луцкевіча ў Вільна. № 2. Старадрукі і рукапісы», якая працягвала і дапаўняла каталог [6]. Пад № 1 там значыцца Жухавіцкае Эвангелле XIV ст., надрукаванае ў 1733 г., са выраблена й А. Луцкевічам вокладкай. Пад № 2 – рукапісны трэбнік за 1545 г., пазначаны ў каталозе таксама пад № 2. Такім чынам, адбывалася дубляванне запісаў каталога ў кнізе. Аналіз почырка дазваляе сцвярджаць, што вяліся яны А. Луцкевічам.

Наступным па часе апісаннем рукапісаў і архіваў беларускіх арганізацый, што захоўваліся ў музеі, быў акт перадачы дакументаў у склад

Інстытута Летуаністыкі Акадэміі навук Літвы ад 11 снежня 1940 г., падпісаны доктарам Б. Грабінскім – апошнім легітымным прадстаўніком ліквідаванага на той час БНТ [7]. Акт складаецца з 31 пункта (апошні дапісаны ад рукі), дзе агулам апісаны склад дакументаў бкларускіх арганізацый на той час: ТБШ (107 тэчак і 1 звязка, пп. 3, 5, 15–18), Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (14 тэчак, п. 13), БНК (31 тэчка, п. 10, 24), Рады БНР (48 тэчак і 1 звязка, п. 7,8, 11), Карэспандэнцыя [рэдакцыі газеты «Наша Ніва»] (1 скрыня і 3 кошыкі, п. 28), БНТ (5 тэчак, п. 25), Беларускіх студэнцкіх арганізацый (2 звязкі, пп. 21, 22), Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ) (5 тэчак, п. 6), Украінскай народнай рэспублікі (УНР) (1 кошык, п. 29), улёткі (1 звязка, п. 19), Беларускай вайсковай арганізацыі (1 звязка, п. 4). Таксама ў спісе пазначаны архіў А. Луцкевіча з нявызначанай колькасцю дакументаў і яшчэ 8 пунктаў нявызначанага зместу, сярод якіх 4 скрыні, перададзеныя з Коўна, а таксама скрыня з кнігамі.

Асноўнае, найбольш поўнае апісанне рукапісаў і архіваў музея праводзілася з 5 траўня прыкладна па жнівень 1944 г. Уладасам Дрэмай. У першых 7 скрынках знаходзілася 436 старадрукаў і рукапісаў. Першыя тры скрынкі неапісаныя, пазначаныя толькі нумары. Наступныя тры ўтрымліваюць толькі нумары старадрукаў і рукапісаў з 2 па 403. 7-я скрынка, што складаецца з 61 пункта, апісаная паадзінкава. У шэрагу адзінак пазначыны нумар па каталогу (РК), а таксама ёсць пазнейшыя пазнакі нумара адзінкі ў Ф. 21 MABL. Магчыма, гэта было зроблена супрацоўнікамі аддзела рукапісаў (Енас Мініус) пры правядзенні апісання ці падчас пазнейшых прац. У скрынцы знаходзіліся найбольш старажытныя царкоўныя рукапісы: Жухавіцкае Евангелле XIV ст., Актоіх XV ст., Аглашэнне Тодара Студыта 1490 г., самы старажытны старадрук – «Тріодь Цветная» з 1483 г. А таксама фотапрынтныя выданні Тураўскага і Аргангельскага выданняў XI ст. Гэтыя каштоўныя дакументы згадваюцца і ў апісаннях А. Луцкевіча і Я. Шутовіча [9]. 8-я скрынка – 63 адзінкі. 18 з іх гэта рукапісы XIX ст., а таксама дакументы К. Душэўскага, А. Луцкевіча, Л. Дубейкаўскага, І. Канчэўскага і інш. У тым ліку Я. Коласа «Другое чытанне для дзетак-беларусаў» (1909). 9-ая скрынка – 63 адзінкі літаратурных рукапісаў, у тым ліку вядомая «Шляхам жыцця» Я. Купалы. Скрынкі 9–13 – гэта рукапісныя акты без анатацый за XVI–XIX стст. Некалькі копій актаў XIV і XV стст. Усяго да XVI ст. – 319 актаў, XVII ст. – 696, XVIII ст. – 992, XIX ст. – 1470, недатаваных 240 і 138 неінвентарызаваных старадрукаў. У 13–15 скрынках каля 200 анатаваных

рукапісаў беларускіх літаратараў, што адносяцца да XX ст., у 13-ай – знакаміты «Аль-Кітаб» XVI ст. У адпаведнасці з запісам ад 17 чэрвеня 1944 г. былі зробленыя копіі 36 рукапісаў на 163 плітках, у тым ліку самыя старажытныя. Усяго, такім чынам, у 15 скрынках 4973 адзінкі: 552 старадрукі, 51 пергамін за XVI–XIX стст., 3824 акты за XVI–XIX стст., 384 літаратурныя рукапісы за XX ст. Гэтая частка была перададзеная на захоўванне да ксяндза А. Станкевіча ў чэрвені 1944 г., а ў пачатку 1946 г. – у аддзел рукапісаў Бібліятэкі Урублеўскіх, дзе і знаходзіцца па сёння [2].

З 16 па 33 (17 скрынак) засталіся на той час ў музеі і былі апісаныя як «Архівы Беларускага музэю ў Вільні, забраныя НКУС пры ЛССР 15–16 ліпеня 1944 г. ». Пераважная большасць з іх – гэта архівы, асобныя тэчкі і дакументы беларускіх арганізацый. Гэта каля 130 розных камітэтаў, з’ездаў, таварыстваў, суполак, газет. Часта вызначыць іх паходжанне ці сумежныя дакументы па апісаннях не падаецца магчымым. Сярод самых вялікіх комплексаў дакументаў беларускіх арганізацый можна адзначыць: архіў БНР (9 пачак, скрынкі 17, 18), архіў УНР (5 пачак, скрынка 32), БСРГ, выбары ў Польскі сейм, беларускі пасольскі клуб (6 пачак, скрынка 19), архіў ТБШ і Беларускай цэнтральнай школьнай рады (13 пачак, скрынкі 21, 22, 23), Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (2 пачкі, скрынка 24), БНТ і Музей (1 пачка, скрынка 24), БНК у Вільна (2 пачкі, скрынка 24), Камітэт дапамогі пацярпелым ад вайны (1 пачка, скрынка 26), Студэнцкі саюз (3 пачкі, скрынка 27), Беларускі кааператыўны банк (2 вазы), беларускія газеты і выдавецтвы (скрынка 26, 30, 33, неапрац.) і інш.

Гэтыя дакументы пасля аператыўнай распрацоўкі паступілі ў Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў (LCVA) не раней за 1945 г. у колькасці 1066 адзінак захоўвання. Сакрэтная частка, якая найперш праходзіла навукова-тэхнічную апрацоўку для выканання аператыўных мэтаў, падрыхтоўкі даведак (у 1947 г. былі падрыхтаваныя першыя даведкі па дейнасці Беларускага нацыянальнага камітэта) і інш. У спісе несакрэтных фондаў 1946 г. пад № 723 пазначаны Беларускі музей імя Івана Луцкевіча ў аб’еме 500 адз. зах. як неапісаны. У спісе сакрэтных фондаў 1947 г. пазначаны 10 фондаў беларускіх арганізацый, большая частка якіх, трэба меркаваць, захоўваліся ў музеі. У тым ліку 45 с/р – 281 Беларускі музей ў Вільна – з пазнакай аб паступленні 1939 г., што немагчыма прыняць як слушную, бо ў гэты час музей яшчэ дзейнічаў і захоўваў фонды беларускіх арганізацый. У 1960 г. частка самых вялікіх комплексаў дакументаў беларускіх арганізацый была перададзена ў БССР і цяпер захоўваецца ў

Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (НАРБ) (7 фондаў) і БДАМЛМ (1 фонд), частка засталася ў LCVA (каля 15 фондаў).

На падставе гістарычных каталогаў і вопісаў, а таксама працы па выяўленні дакументаў у сховішчах Беларусі і Літвы, зроблена першасная рэканструкцыя месцаў сучаснага захоўвання дакументаў 12 беларускіх арганізацый міжваеннага перыяду (Дадатак 1), а таксама прапанаваны спіс архіваў беларускіх арганізацый для далейшай рэканструкцыі (Дадатак 2).

На падставе праведзенай рэканструкцыі можна канстатаваць, што Беларускі музей у Вільна з'яўляўся даволі буйным цэнтрам камплектавання архівамі беларускіх арганізацый. Ён налічваў больш двух дзясяткаў комплексаў дакументаў грамадскіх арганізацый, партый, банка, рэдакцый газет, выдавецтваў і інш. Камплектаванне музея архівамі беларускіх арганізацый пачалося з 1920-х гг. і набыло найбольшыя масштабы ў другой палове 1930-х гг., калі значная іх колькасць была зачыненая спачатку польскімі, а потым савецкімі ўладамі. Гэтыя архівы ў музеі не мелі вопісаў, але ўлічваліся ў каталогах і апісаннях 1920-х гг., 1935 і 1944 гг., а таксама акце перадачы 1940 г., што стала асноўнай падставай для суаднясення архіўных фондаў беларускіх арганізацый ў сучасных сховішчах з дзейнасцю музея. Значную частку сувязей паміж дакументамі беларускіх арганізацый і сучаснымі сховішчамі можна вызначыць толькі на падставе вопісу У. Дрэмы ад 1944 г. Пераемнасць ва ўліковых дакументах (асабліва беларускіх архіваў) не прасочваецца. Працэс захоўвання архіваў беларускіх арганізацый наўпрост звязаны з лёсам музея і траекторыяй падзелу яго збораў. У сучасных сховішчах фандаванне архіваў беларускіх арганізацый, а таксама іх размеркаванне па сховішчах адбывалася пераважна без уліку кантэксту і сувязяў з музеем.

**Дадатак 1. Рэканструкцыя архіваў беларускіх арганізацый, якія захоўваліся ў Беларускім музеі імя І. Луцкевіча ў Вільна.**

1. *Беларускі нацыянальны камітэт (БНК) (Віленскі беларускі нацыянальны камітэт) (1921–1938).*

LCVA (1945) Ф. 306. Воп. 1. 13 адз. зах. за 1919–1921, 1933–1944.

НАРБ. (1960) Ф. 879, 46 ед. хр. за 1919–1938.

MABL. (1946). Ф. 21. Адз. зах. 2061 (Кніга запісу грашовых паступленняў, 1921).

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. адз. зах 131–134.

АРКР ЦНБ НАН Беларусі (сумежныя дакументы). Ф. 23. Адз. зах. 46, 50 і інш. за 1942, 1943.

2. *Таварыства беларускай школы (ТБШ) (1921–1936).*

LCVA (1945) Ф. 361. 27 адз. зах. за 1919–1936.

НАРБ (1960) Ф. 883. 111 адз. зах. за 1919–1936.

MABL (1946) Ф. 21. Адз. зах. 869, 2080, 2237 (дакументы Цэнтральнай беларускай школьнай рады).

БДАМЛМ Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 19–21.

3. *Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (1926–1936).*

LCVA (1945) Ф. 361. Воп. 2. 10 адз. зах. за 1926–1936.

НАРБ (1960) Ф. 880. 22 адз. зах. за 1926–1936.

4. *Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ) (1925–1927).*

LCVA (1945) Ф. 365. Воп. 1–2. 108 адз. зах. за 1920–1930.

НАРБ (1960) Ф. 882. 256 адз. зах. за 1925–1928.

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 194.

5. *Студэнцкія арганізацыі (Згуртаванне беларускіх студэнцкіх арганізацый у Празе, Беларускі студэнцкі саюз) (1924–1939).*

LCVA (1945) Ф. 366 (Згуртаванне беларускіх студэнцкіх арганізацый у Празе). 34 адз. зах. 1920–1929; Ф. 372 (Грамада беларускай моладзі ў Вільна). 10 адз. зах. 1919–1920.

НАРБ (1960). Ф. 884 (Беларускі студэнцкі саюз (БСС) пры Універсітэце Стэфана Баторыя, г. . Вільна), 61 адз. зах. 1921–1939.

MABL (1946). Ф. 21. Адз. зах. 2265 (Беларускі студэнцкі саюз (БСС) пры Універсітэце Стэфана Баторыя, г. Вільна).

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 1. Воп. 1. Адз. зах. 111–115.

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 23-25 (Таварыства беларусазнаўства пры Віленскім універсітэце), 174–188 (Саюз моладзі «Беларускі сакол» у Празе).

6. *Цэнтральная рада Віленшчны і Гродзеншчыны (1919–1921).*

НАРБ (1960). Ф. 878. 25 адз. зах. за 1917–1921; Ф. 591. Воп. 1. Адз. зах. 247.

MABL (1946). Ф. 21. Адз. зах. 2078, 2079, 2214.

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 154.

7. *БНР (Рада БНР, Народны сакратарыят) 1918 – [1920-я гг.].*

LCVA (1945). Ф. 582. Воп. 1–2. 136 адз. зах. за 1917–1925, 1932 гг.

НАРБ (сумежныя дакументы). Ф. 827 (Генеральнае консульства Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) ў Канстантынопалі). 465 адз. зах., 1920-1923 (перададзены з Чэхіі, замежны архіў); Ф. 864

(Консульства Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) ў Рызе). 87 адз. зах., 1919–1921 (перададзены з Латвіі).

MABL (1946). Ф. 21. Адз. зах. 2059, 2077, (ліставанне, аб'явы, паведамленні).

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 142.

8. *Дырэкцыя УНР (1918–1920).*

LCVA (сумежныя дакументы ?). Ф. 829. Воп. 1. 9 адз. зах. 1918–1920; Ф. 307 (Украінская дыпляматычная місія на Каўказе). Воп. 1. 56 адз. зах. за 1918–1921, 1951.

MABL (1946). Ф. 21. Адз. зах. 2208 (галава Украінскай дыпламатычнай місіі на Каўказе).

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 307–310.

9. *Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (1915–1920-я гг.).*

LCVA (1945) . Ф. 361. Воп. 5. 21 адз. зах. за 1914–1919.

MABL (1946). Ф. 21. Адз. зах. 2231.

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 124 –130.

10. *Беларускае навуковае таварыства (БНТ) (1921–1940).*

LCVA (1945). Ф. 281. Воп. 1. 22 адз. зах.

НАРБ. Ф. 591. Воп. 1. Адз. зах. 248 за 1913–1938.

MABL (1946). Ф. 21. Адз. зах. 825.

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 3–8.

11. *Беларускі музей імя І. Луцкевіча ў Вільна (1921–1945).*

LCVA (1945). Ф. 281. Воп. 1. 16 адз. зах. за 1927–1944.

НАРБ. Ф. 591. Воп. 1. Адз. зах. 251, 258.

MABL (1946). Ф. 21. Адз. зах. 376–379, 2048, 2163, 2296, 2302, 2309.

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. адз. зах. 1–2.

12. *Беларускія газеты і выдавецтвы («Наша Ніва» і інш.).*

LCVA (1945). Ф. 368. 60 адз. зах. за 1909–1939.

НАРБ. Ф. 591. Воп. 1. Адз. зах. 256 («Наша Ніва»), 264 («Калоссе»).

MABL (1946). Ф. 21. («Наша Ніва»). Адз. зах. 51, 57, 83, 138,139, 154, 261–264, 267, 273, 274, 349, 845, 848, 2200, 2201; Ф. 23. Адз. зах. 450–451 («Наша Ніва»), 416–449 («Калоссе»).

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 68–108 («Наша Ніва»), 31–67, 109–123.

**Дадатак 2. Спіс архіваў беларускіх арганізацый для далейшай рэканструкцыі.**

*1. Беларускі кааператыўны банк, г. Вільна.*

НАРБ (1960) Ф. 881, 266 адз. зах., 1919–1939.

*2. Беларускае кааператыўнае таварыства «Пчала» (1928–1938).*

LCVA (1945) Ф. 344. Воп. 1. 5 адз. зах. за 1928–1938 гг.

*3. Таварыства помачы насельніцтву беларускіх земляў у Польшчы, пацярпелых ад няўраджаю (Towarzystwo Pomocy Ludności Ziem Białoruskich w Polsce dotkniętych klęską nieurodzaju) (1929).*

LCVA (1945) Ф. 361. Воп. 4. 6 адз. зах. за 1929.

*4. Калекцыя ўлётак камуністычных і сацыялістычных партый у Польшчы (1918–1938).*

LCVA. Ф. 1163. Воп. 1–2. 1627 адз. зах.

*5. Грамада Беларускай Моладзі ў Вільна (1919–1920).*

LCVA. Ф. 372. Воп. 1. 10 адз. зах. за 1919–1920. MABL (1946) Ф. 21. Адз. зах. 2171, 2217.

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 32.

*6. Цэнтральная беларуская вайсковая рада (1917–1918).*

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах 157–166.

*7. Саюз нацыянальна-культурнага адраджэння ў Вільна (1918).*

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. ах. 16–17.

*8. Беларускае культурна-аветнае таварыства ў Коўна.*

БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 30.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Навіна А. [Луцкевіч А.] З недрукаванае спадчыны па М. Багдановічу // Запісы Беларускага навуковага таварыства. Вільня, 1938. Сш. 1.
2. Іванова В. Беларускі музей імя Івана Луцкевіча ў Вільні: шлях да ліквідацыі // Homo Historicus. Гадавік антрапалагічнай гісторыі. Мінск, 2022. С. 92–142.
3. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (АРКР ЦНБ НАН). Ф. 23. Воп. 1. Адз. зах. 559.
4. Аддзел рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі акадэміі навук Літвы (MABL). Ф. 21. 2311 адз. зах.
5. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). Ф. 3. Воп 1–3. 496 адз. зах.
6. MABL. Ф. 21. Адз . зах. 379. Лл. 1–5.
7. Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў (LCVA). Ф. 1001. Воп. 1. Адз. зах. 26. Арк. 8–8 адв.
8. MABL. Ф. 21. Адз. зах. 2163. Лл. 1-25; Часткова апуб.: Лабынцаў Ю. Архіў беларускага адраджэння: (дакументальныя помнікі беларускай царкоўнай і

грамадзянскай гісторыі ў зборах Музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні). Мінск, 1993. С. 20–31.
9. АРКР ЦНБ НАН. Ф. 1. Воп. 1. Адз. зах. 384. Лл. 8–10 ; БДАМЛМ. Ф. 518. Воп. 1. Адз. зах. 1018. Арк. 13; Луцкевіч А. Беларускі Музэй ім. Івана Луцкевіча // Гадавік Беларускага навуковага таварыства / Беларус. навук. т-ва. Вільня, 1933. Кн. 1. С. 176–182.
10. LCVA. Ф. R855. Воп. 1. Адз. зах. 2. Арк. 29.
11. LCVA. Ф. R855. Воп. 2. Адз. зах. 19 а.

## КАНЦЭПТ «ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА» (АРХІВА ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ ЛІТОЎСКІХ) У АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 1991–2021 ГГ.

***А. М. Латушкін***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030,*

*г. Мінск, Беларусь, Latushkin@bsu.by.*

На прыкладзе гістарычных даследаванняў, праведзеных у Рэспубліцы Беларусь у 1991–2021 гг., аналізуюцца змест і эвалюцыя паняцця «дзяржаўны архіў Вялікага Княства Літоўскага», погляды на структуру і склад дакументальнай спадчыны вялікіх князёў літоўскіх, паняційны апарат вучоных, што прымяняецца да яе ў цэлым і да яе асобных частак – комплексаў, у прыватнасці – да комплекса арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння. Робіцца выснова аб незавершанасці працэса распрацоўкі навуковай тэрміналогіі тэмы. Канстатуецца неабходнасць пераходу да стадый яе ўпарадкавання (гарманізацыі) і ўніфікацыі.

***Ключавыя словы:*** Вялікае Княства Літоўскае; ВКЛ; дзяржаўны архіў ВКЛ; Метрыка ВКЛ; комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння; паняційны апарат гісторыка; тэрміналогія гістарычнай навукі.

## КОНЦЕПТ «ГОСУДАРСТВЕННОГО АРХІВА ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО» (АРХИВА ВЕЛИКИХ КНЯЗЕЙ ЛИТОВСКИХ) В ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ИСТОРИОГРАФИИ 1991–2021 ГГ.

***А. Н. Латушкин***

*Белорусский государственный университет,пр. Независимости, 4, 220030,*

*г. Минск, Беларусь, Latushkin@bsu.by.*

На примере исторических исследований, проведенных в Республике Беларусь в 1991–2021 гг., анализируются содержание и эволюция понятия «государственный архив Великого княжества Литовского», взгляды на структуру и состав документального наследия великих князей литовских, понятийный аппарат учёных, относящийся к нему в целом и к его отдельным частям-комплексам, в частности – к комплексу оригиналов актов общегосударственного значения. Делается вывод о незавершенности процесса разработки научной терминологии темы. Констатируется необходимость перехода к этапам его упорядочения (гармонизации) и унификации.